# Саюзны вопыт аднаўлення

**Вынікі працы па пераадоленн! наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС і напрамкі развіцця пацярпелых тэрыторый абмеркавалі ў Гомелі эксперты пастаянна дзеючага семінара пры Парламенцкім сходзе Саюза Беларусі і Расіі.**

Створаны ў 2006 г. па ініцыятыве саюзных парламентарыяў пастанна дзеючы семінар - устойлівая экспертна-кіраўнічая пляцоўка, якая дае магчымасць комплексна разглядаць актуальныя пытанні супрацоўніцтва Беларусі і Расіі ў рамках Саюзнай дзяржавы. Па выніках работы рыхтуецца дакумент з практычнымі рэкамендацыямі.

Сёлета тэма семінара - «Спадчына Чарнобыля. Вынікі 40-гадовай работы па пераадоленні наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС». Да абмеркавання падключыліся прадстаунікі міністэрстваў па надзвычайных сітуацыях, энергетыкі, лясной гаспадаркі Беларусі, Міністэрства прыродных рэсурсаў і экалогіі Расіі, навукова-даследчых інстытутаў.

Сёння ў гэтым кірунку сфарміраваны значны масіў практычнага вопыту. У рамках Саюзнай дзяржавы ужо рэалізаваны праграмы, якія ахоплівалі шырокі спектр задач: ад радыяцыйнага маніторынгу і навуковых даследаванняў да сацыяльнай падтрымкі насельніцтва і развіцця інфраструктуры. іх рэалізацыя дазволіла аб'яднаць фінансавыя рэсурсы і арганізацыйныя магчымасці дзвюх дзяржау, выбудаваць паслядоуную сістэму работы.

Паводле слоў **старшыні Пастаяннай камісіі па экалогіі і прыродакарыстанні Палаты прадстаунікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Жанны ЧАРНЯУСКАЙ**, рэалізавана ўжо пяць сумесных саюзных праграм, падрыхтавана і распрацавана шостая. Асноуныя яе напрамкі будуць звязаны з тым, што ў Беларусі і Расіі застаюцца землі, якія патрабуюць рэабілітацыі. Другі напрамак - аказанне спецыялізаванай медыцынскай дапамгі. Дарэчы, сёння ужо існуюць адпаведныя тэхналогіі, заснаваныя на ядзернай медыцыне.

### Зона асаблівай ўвагі

У фокусе увагі сумеснай дзейнасці і лясны фонд. Лясы у значнай ступені прынялі на сябе наступствы забруджвання, і сёння іх стан патрабуе пастаяннага кантролю. Так, сярод актуальных задач - абарона лясных масіваў ад пажараў.

Апрача таго, на гэтых тэрыторыях працуюць прадпрыемствы, якія вырабляюць прадукты харчавання. Таму астэма радыяцыйнага кантролю і маніторынгу - найважнейшае пытанне атрымання чыстай прадукцыі.

Экалагічны складнік ў рабоце па пераадоленні наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС застаецца адным з ключавых. Працягваецца удакладненне шчыльнасці забруджвання тэрыторый населеных пунктаў, лясных і сельскагаспадарчых угоддзяў. Паралельна рэалізуюцца меры па зніжэнні рызык трансгранічнага пераносу радыёактыуных элементаў, што асабліва важна ва ўмовах блізкасці тэрыторый дзвюх дзяржаў. Значная ўвага надаецца вяртанню зямель у гаспадарчы абарот пры выкананні ўсіх патрабаванняў бяспекі.

**На фінансаванне новай саюзнай праграмы па пераадоленні наступстваў аварыі на ЧАЭС плануецца накіраваць да 2 млрд расійскіх рублёў.**

### Даступнасць дапамогі

Як падкрэсліла **начальнк дэпартамента сацыяльнай палітыкі і інфармацыйнага забеспячэння Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы Вольга БАРАНЕНКА,** значны блок саюзных праграм звязаны з сацыяльнай абаронай насельніцтва і развіццём сістэмы аховы здароўя.

- За 40 гадоў мы засвоілі галоўны ўрок Чарнобыля - супрацьстаяць наступствам аварыі, адраджаць жыццё на пацярпелых тэрыторыях лягчэй разам. Менавіта гэтае

разумение стала падмуркам працы ў рамках Саюзнай дзяржавы, - падкрэсліла Вольга Бараненка.

Асаблівая ўвага ў сумеснай рабоце надаецца павышэнню даступнасці якасці медыцынскай дапамогі грамадзянам Беларусі і Расіі, распрацоўкам і ўкараненню новых медыцынскіх тэхналогій.

– Так, з 2016 да 2025 г. уключна спецыялізаваную і высокатэхналагічную медыцынскую дапамогу атрымалі 13 202 пацыенты. Праводзяцца аперацыі па трансплантацыі нырак, выконваюцца вельмі складаныя хірургічныя умяшанні пры захворваннях сэрца і сасудаў і інш. Лячэнне ажыццяўляецца на базе трох вядучых шматпрофільных медыцынскіх цэнтраў Беларусі і Расіі.

– Разнапланавая дзейнасць па пераадоленні наступстваў Чарнобыльскай аварыі ў рамках Саюзнай дзяржавы, безумоўна, прыносіць практычную карысць і Беларусі, і Расіі і ў поўнай меры адпавядае інтарэсам нашых народаў, - падкрэсліла Вольга Бараненка. - Мы можам з упэўненасцю сказаць, што работа па рэабілітацыш, адраджэннш пацярпелых зямель, стварэннш бяспечных умоў пражывання людзей, ахове іх здароўя будзе працягнута. Мы рыхтуем новыя праграмы, укараняем сучасныя тэхналогіі, каб абараніць будучыя пакаленні.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА**